Міхась Болсун

# *Там, дзе задумлівы Сож...*

ВЕРШЫ

Гомель
ААТ «Полеспечать»
2006

## *МОЙ ВЕРШ*

*Мае радкі – пачуццяў птушкі,*
*Што прагнуць высака ляцець.*
*Я іх душой расціў і гушкаў*
*Сярод людзей і для людзей.*

*Мае радкі – прызнанне сына*
*Ў любові роднае зямлі –*
*Яна жыве і не загіне,*
*Якія б ветры не гулі...*

*Мае радкі – надзеі крылы*
*У вечны мір, шчаслівы міг.*
*Мне свіст шпакоў вясною мілы,*
*І бег імклівы ўдалеч крыг.*

*Мае радкі – пяшчота песні,*
*Якую сэрцам трэба пець.*
*Каго хмяліў пах бэзу весні –*
*Паэта зможа зразумець.*

*Мае радкі – слоў шчырых зерне,*
*Што сею рупна я штодзень.*
*І хоць даўгоў жыццю не вернеш –*
*Пішу, пакуль душа вядзе...*





# Прысяга на роднасць

## Я — РАДЗІМІЧ

Адкуль жа я? З сівых стагоддзяў,
Радзім — мой продак, сын Зямлі.
Аб ім паданні сёння ходзяць,
Як у Пасожжы род сяліў.

Таму радзімічам завуся,
І мой выток, мая радня
Па ўсёй Усходняй Беларусі,
Аб гэтым помню я штодня.

Расце, буяе дрэва роду,
Карэнні сок нясуць галлю.
Калі ж зняможуцца праз годы —
Кладзем паважліва ў зямлю.

А вецце з новай, прагнай сілай
Да сонца цягне зноў лісцё...
Нас беды розныя касілі,
Ды ўсё ж за іх мацней жыццё!

*14.01.2006.*



## МАЯ БЕЛАЯ РУСЬ

Фарбай белай снягоў
Снежань піша пейзажы,
Надвячоркам кладзе
На палотны зару.
Кожны штрых на душу
Улюблёнасцю ляжа,
Бо такая зімой
Мая Белая Русь.

А вясновым дзяньком
Палячу я на ўзлессе,
Дзе пралесак букет
Для каханай збяру.
Думкам крылы дадуць
Жаўруковыя песні,
І красою ў палон
Возьме Белая Русь.

Шэпт на полі лаўлю
Жыта, спелай пшаніцы.
Заракоча камбайн —
Жніва слаўлю пару!
Спёка зноў завядзе
Да бруістай крыніцы,
Дзе напоіць мяне
Мая Белая Русь.

Жураўлінай тугой
Прагалосяць нябёсы,
І рассцеле паўсюль
Восень з лісця абрус.
На прырэчных лугах
Іней вып'е ўсе росы...
Непаўторны мой край —
Мая Белая Русь!

*26.07.2005.*



* * *

Чым больш жыву,
тым больш люблю
цябе, мой край
чачэрскі,
да болю родную
зямлю,
людзей,
душой не чэрствых.

Маленства даўнія
гады
і сцежкі маладосці
жывуць у памяці
заўжды,
яны — святое штосьці.

Шугаюць
квеценню сады,
бяжыць шнурком
Каўпіта.
І ў кожны мой
прыезд сюды,
бы кніга,
край раскрыты.

*10.09.2004.*

* * *

Над Чачэрскам развеяўся золак,
Над ім звонкая, крохкая ціш.
Атухаюць агеньчыкі зорак.
Залаціцца царквы ярка крыж.

А бадзяга-туман зноў мярэжай
Лёг сушыцца на вецце кустоў.
Парк на Замкавай, ратушы вежы
Ранак барвай фарбуе густой.

З дрэў сцякаюць нячутна расінкі.
Лазняк сонна глядзіць у раку.
А з усходу, з суседняй Расіі
Паказала ўжо сонца шчаку.

Гэты міг да жыцця любоў будзіць,
Сум дрымотны я з сэрца ганю.
П'ю жадобна, на поўныя грудзі,
Горад родны, тваю цішыню.

*04.07.2005.*



## РАТУША

Ля ціхай Замкавай гары
Ляжыць квадрат цэнтральнай плошчы,
Жаўцеюць ратушы муры,
Пячэ іх спёка, ліўні хвошчаць.

Таўшчэзнай кладкі камяні
Хаваюць даўнія сакрэты,
Калі б умелі гаманіць
Зашмат бы расказалі свету,

Як жыў, тварыў вякі Чачэрск,
Названы іменем Чачоры,
Якая стужкаю цячэ
У Сож, а з ім — далей, да мора.

...Паўсюль гісторыі сляды,
Яе блукае глуха рэха.
Цары трымалі курс сюды,
І Пушкін некалі тут ехаў.

Глядзіцца ратуша ў блакіт —
Славуты нашых продкаў помнік.
Адсюль ляцяць ва ўсе бакі
Шырокіх, светлых вуліц промні.

*18.11.2005.*

## СЦЕЖКА ЎДАЛЕЧ ЗАВЕ...

Над Чачэрскам плывуць,
Нібы з ваты, аблокі.
Сцежка ўдалеч заве,
Дзе задумлівы Сож.
Срэбрам ззяе трава,
Куст лазы невысокі –
Уначы шапацеў
Цёплы чэрвеньскі дождж.

Пачастуе рака
Тут наварыстай юшкай.
Набяру на ўзлессі
Жменю пахкіх суніц.
Лягу ціха ў траву,
Спеў паслухаю птушкі,
На ўспамін забяру
Звон бруістых крыніц.

Ля Асух* незнарок
Я спужаю казулю.
Голас качка падасць
Пад кудлатым кустом...
Куды позірк не кінь –
Кут мой родны красуе,
Дае крылы душы
Прамяністы прастор.

*26.12.2005.*

---
* Асухі – назва ўрочышча



* * *

Па-над вёскай маёй
Купал неба высокі.
Раніцою ў садах
Славяць сонца шпакі.
Гай напоіць усіх
Тут бярозавым сокам.
Возьмуць сэрца ў палон
Дабрынёй землякі.

З гэтым мілым кутком
Пупавінаю звязан.
На вільготным пяску
Друкаваў я сляды.
Бавіў час з сябруком
Пад разгалістым вязам,
І цярпелі ад нас
У суседзяў сады.

Помню першы мазоль,
Што касcё “падарыла”.
Помню песні я жней,
Што кранала да слёз.
На вячоркі лятаў
Юнаком, бы на крылах,
Пакуль з вёскі мяне
Лёс удалеч павёз.

Прабягаюць гады...
Месцы розныя бачыў,
Толькі лепш, чым мой кут,
Для душы і няма.
Усміхаецца тут
У затоцы гарлачык,
І палотны снягоў
Тчэ рупліва зіма.

Прыязджаю сюды,
У знаёмую вулку
І далёкіх гадоў
Зноў прыкметы лаўлю.
Думак лётае рой,
Сэрца тахкае гулка,
І ў каторы ўжо раз
Вусны шэпчуць:"Люблю"...

*03.12.2005.*



## ПА̀ЛАМ*

Урочышча Рэчка.
Пасёлачак Палам.
Прыгожага лесу
Навокал масіў.
Адсюль я калісьці
З дзіцячым запалам
Грыбное багацце
З сябрамі насіў.

Аўтограф расою
Пісалі падэшвы.
Спаўзаў у нізіны
Бадзяга-туман.
Арэхі без меры
Дарыў нам арэшнік,
І ягады шчодра
Ссыпаў лес у жбан.

Бы ў вырай далёкі
Гады адляцелі.
Чарнобыль тут хаты
Усе праглынуў.
На котлішчы гляну —
Мурашкі па целе,

*Палам — былы пасёлак на Чачэршчыне

Далёкую ўспомніш
Міжволі вясну.

Глядзіцца куточак
Параненай птушкай.
У працы і песнях
Без стомы ён жыў.
Падчас ліхалецця
Мяне Палам гушкаў,
Удзячнасць людская
Яму — без мяжы.

І памяць не здрадзіць,
Любоў не ачахне,
Пачуцці нязменна
Сюды я нясу.
...Жывіцай, грыбамі
Лес густа тут пахне,
І хочацца зноўку
Памацаць расу.

*27.11.2005.*



## ДЗЕ ЖЫТЫ ШАПАЦЯЦЬ...

Зноўку памяць імчыць
У кут родны — Палессе,
Дзе маленства гады
Грэў прырэчны пясок,
Дзе звінела заўжды
Жней гаючая песня.
Дзе ўранні і я
Будзіў поплаў касой.

І прыходзяць у сны
Салаўіныя ночы,
Калі хлопцам міжволі
Хмеліць спеў галаву,
І шчасліва глядзяць
Закаханыя вочы,
І туману ля ног
Космы сонна плывуць.

Лес ахвотна дарыў
Пахкіх ягад гарлачык,
А Каўпіта-рака —
На вячэру ўлоў.
Колькі там землякоў —
Рупных, шчодрых — пабачыў!
І запала ў душу
Мудрасць матчыных слоў.

Год пражытых лісты
Памяць хутка гартае —
Безліч датаў мігціць,
І людзей, і падзей,—
Ды ў куток дарагі
Пастаянна вяртае,
Дзе жыты шапацяць,
Чмель над кветкай гудзе.

*22.04.2005.*



## СПЯВАЛА ЦІХА САМАПРАДКА

У вокны прыцемкі глядзелі,
Цішэлі вуліцы сяла...
З-пад пальцаў матчыных кудзеля
Кужэльнай ніткаю цякла.
Спявала ціха самапрадка,
Вяла адвечны свой матыў,
Каб потым ткала самабранку,
Ручнік на покуць для святых
І рэчы розныя для быту
Матулі рупная рука.
Дагэтуль помню, не забыта,
Як цэўкі я на ўток сукаў.
Палотнаў доўгія палоскі
Сцялілі ў лузе па вясне
Жанкі-ткачыхі з нашай вёскі,
Каб кужаль быў бялей за снег.
І трубкі гэтае тканіны,
Бы скарб, у куфрах бераглі.
І на пасаг, і на радзіны
Ішоў плён працы і зямлі.
...Цяпер не стукне бёрда ў хаце.
Ручнік сялянскі я бяру —
Дарунак колішні ад маці,
Цяпло душы яе і рук.

*22.09.2004.*

ДЗЕДАВА ХАТА

Да кладкі знаёмай
Лячу — не іду я,
Там лозы глядзяцца
Ў люстэрка ракі.
Ля дзедавай хаты
Вяз цішу вартуе,
Высока узняўшы
Над дахам сукі.

Ігруша старая
Мне веццем махае.
Сцішэлая лазня
Стаіць на мяжы.
Хлапчук незнаёмы
"Днём добрым" вітае.
Шчымлівасць пачуццяў
На сэрцы ляжыць.

Вяртае зноў памяць
У даўнія зімы,
У цёплае лета,
На росны той луг,
Дзе пасвіў гусей я,
Чакаў дзеда Кліма,
Ён ведаў: галодны
Унучак-пастух.



Праснак умінаў я -
Аж трэск за вушамі.
Настрой узнімаўся,
Ясніўся пагляд,
І дзед для прыліку
Бяззуба мне шамкаў,
Сабраўшы ў дзяружку
Сухога галля:

— Унучак, прыходзь-ка,
Ўжо вішні паспелі,
Сарокі - зладзейкі
Бязбожна клююць.
...Гайдаўся на голлі
Я, бы на арэлях.
Вішняк той успомню —
І слінкі цякуць.

Малюнкі маленства
У сны мне прыходзяць,
Хоць часу не спыніш
Імклівай хады.
Сягоння маркотна
На тым агародзе:
Зямелька дзічэе,
Старэюць сады.

*25.05.2006.*

## ПОЛЕ

Мне часта сніцца тое поле:
Пасевы бульбы — аксаміт.
І для асоту тут прыволле,
Ды моцы ў целе быў ліміт.

Акучнік мне — амаль па плечы,
А меншы хто — каня вадзіў.
Дарослых клопат нам, малечы,
Даверыў строгі брыгадзір.

І мы стараліся што сілы,
Ішлі разорай басанож.
Загар карычневы насілі,
Аблуплены пад сонцам нос.

На конях верхам, бы на крылах,
Ляцелі ў поўдзень да ракі,
Купалі іх, рупліва мылі,
Дурэлі самі ля ракіт.

Калі ж зусім слабела спёка,
Сціхалі злыя авадні,
Учотчык мераў поле вокам,
За дзень выводзіў працадні.



І гонар нас да неба ўзносіў,
Што ёсць у справу наш уклад.
Давалі ж крыху бульбы ўвосень
І яблык — быў калгасны сад.

Такое помніцца міжволі,
Гадоў пражытых не лічу,
Ды толькі зноў на тое поле
На крылах памяці лячу.

*24.11.2004.*

## ТАПТУХА

Дуга з ляшчыны,
Тры рабрыны —
Таптухі лёгкае каркас.
Хадзіў я з ёй на азярыны,
Дзе лінь вадзіўся і карась.

У рэчцы вузкае ля вёскі,
На перагоне для кароў,
Дзе бераг быў пясчаны, плоскі,
Лавіў заўзята печкуроў.

Шчупак зялёнаю тарпедай
У снасць з разгону часам біў,
Хто хоць аднойчы гэта зведаў —
Навек таптуху палюбіў.

Цяпер жа тол, электравуды
Бярэ на рэчку браканьер,
Бы на вайне, грыміць усюды —
Знікае рыба, гіне звер.

І печкуру ў Чырвонай кнізе
Радок, напэўна, адвядуць.
Рака змялела, чахне ў хмызе:
Прыгналі з тэхнікай бяду.



Бяздумна русла выпрамлялі —
Былой Каўпіты* ўжо няма.
Каўшом зраўнялі яе хвалі
І грошы спляжылі дарма.

... Гляджу на плёс я сумным вокам,
Хадзіў з таптухай тут даўно.
Гартае памяць час далёкі,
Бы кадры яркія кіно.

*16.10.2004.*

*Каўпіта—рэчка ў Чачэрскім раёне

## КОНІ

Пасвяцца коні
На сонечным лузе,
Цёплыя губы —
У цёплай траве.
Смела ў табун
Прытабуніўся бусел,
Птушка з жывёлай
У згодзе жыве.

Мілы малюнак.
Мне родныя гукі —
Зычнае ржанне
Тут маці-кабыл.
Прагна да грывы
Цягнуцца рукі,
Помню: галопам
Уздыбліваў пыл.

Шчыра пагладжу
Гнядому я шыю,
Верхам па сцежцы
Скакун панясе.
Радасць наскрозь
Маё цела прашые,
Знікнуць імгненна
Клопаты ўсе…



…Пасвяцца коні —
Малюнак адвечны.
Толькі не ўчуеш
Сягоння тут слоў
Звонкіх, бы песня,
Наіўных, хлапечых.
Дзеткі тут — рэдкасць —
Віна не буслоў.

*05.07.2005.*

## КУКЛІЧЫ

*Сувалаву В. П.*

Кучаравы сасняк
Каля Кукліч не спіць:
Птушак слухае спеў,
Пошум ветру на ўзгорку...
Перапёлкі ў жытах
Просяць вечнае: “Піць”.
Ноч ссыпае з нябёс
На плёс Покаці зоркі.

У зялёным кутку,
Каля стыку дарог
Крыж трымае ручнік,
Ключ гамоніць крыніцы,—
Час у душах людзей
Вернасць Богу збярог,
Тут яму і зямлі
Кожны можа маліцца.

Пяты век вёска свой
Крыж жыццёвы нясе.
Шчасце песняй было,
Войны – чорнай навалай.
Сіла ж мужных людзей
Беды сцерла усе,



Бо Тарасенка – кум,
А сват лепшы – Сувалаў.

Уся вёска – радня,
Карані ў іх адны.
Хіба мала такіх
Параскідана ў свеце?
... Лес грыбамі прапах
І жывіцай сасны.
Бы далёкі маяк,
Вокны вёсачкі свецяць,
Каб з дарог да яе
Не збіваліся дзеці...

*23.08.2006.*